**УДК 821.161.3**

# “НАШТО ЧАЛАВЕК ЖЫВЕ?” ФІЛАСОФСКАЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА РАМАНАЎ У. ГНІЛАМЁДАВА

***канд. філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***zoya.tretyak@rambler.ru***

*Артыкул прысвечаны разгляду раманаў У. Гніламёдава “Уліс з Прускі”, “Расія”, “Вяртанне”, “Валошкі на мяжы” і “Вайна” ў сувязі з паняццем вайны як навалы-кантынуума. Аналізуецца ўплыў перыядычных сацыяльна-палітычных катаклізмаў на асобу шараговага персанажа-беларуса. Выяўляюцца розныя падыходы да вырашэння канцэптуальнага пытання “Нашто чалавек жыве?” у залежнасці ад грамадскай сітуацыі, вопыту і светаўспрымання герояў. Падкрэсліваецца, што немагчымасць адказаць на гэтае пытанне прыводзіць асобных персанажаў У. Гніламёдава да прыняцця жыцця ва ўсім комплексе яго станоўчых і адмоўных фактараў.*

***Ключавыя словы**: беларуская літаратура, сямейная хроніка, навала-кантынуум, У. Гніламёдаў.*

**Уводзіны**. Айчыннае мастацтва слова XX ст. неаднаразова звяртался да жанру сямейнай хронікі, які дазваляў не толькі дэталёва распавесці пра лёс тыповага беларуса ў яго натуральнай повязі з родзічамі і акаляючым соцыумам, але і заглыбіцца ў нацыянальную гісторыю, хада якой знітавала ў адно цэлае розныя чалавечыя лёсы. Хранікальны лад мыслення патрабаваў павольнага выкладу матэрыялу, які акрамя непасрэднага падзейнага плану ўбіраў у сябе звесткі гісторыка-этнаграфічнага характару, неабходныя для прачытання твораў. Вялікі часавы ахоп дазваляў прасачыць пэўныя тэндэнцыі ў развіцці грамадства, вызначыць прыроду і вынікі аксіялагічных змен, што прыпалі на XX ст. Акрамя таго, беларускія празаікі спрабавалі высветліць магчымасці сімбіёзу дакументальнага і мастацкага, стваралі адмысловы эпас часу войн і рэвалюцый.

**Асноўная частка**. Асобнае месца ў айчыннай літаратуры пачатку XXI ст. займаюць раманы У. Гніламёдава “Уліс з Прускі”, “Расія”, “Вяртанне”, “Валошкі на мяжы”, “Вайна”, “Пасля вайны”. Паводле І. Шаўляковай-Барзенка, “разгортваючыся ў традыцыях класічнага рэалістычнага эпасу, мастацкая хроніка сям’і Кужаляў набывае сімвалічную важкасць гісторыка-мастацкага летапісу, дзе занатоўваюцца важнейшыя падзеі нацыянальнай гісторыі XX ст.” [1, с. 29]. Маштабнае палатно, угрунтаванае ў сямейную гісторыю аўтара, ахоплівае першую палову мінулага стагоддзя. Аўтар кніг скіроўвае чытацкую ўвагу на шэраг падзей, вядомых не толькі па падручніках, але і творах айчынных і замежных мастакоў слова (напрыклад, творы В. Адамчыка, М. Лобана, І. Чыгрынава, І. Шамякіна, Дж. Галсуорсі, К. Фолета і інш.).

У раманах з рознай ступенню падрабязнасці разглядаюцца рэвалюцыя 1905 г., Руска-японская вайна, сталыпінская аграрная рэформа, эміграцыя шараговага беларуса ў ЗША ці Канаду, Першая сусветная вайна, падзеі лютага і кастрычніка 1917 г. у расійскай глыбінцы, Грамадзянская вайна, перажытая беларусам-бежанцам у выгнанні, дзе ён даведаўся пра ўтварэнне БНР. Фрагментарна ў рамане “Вяртанне” прыгадваюцца акупацыя этнічных беларускіх зямель немцамі, паход Чырвонай Арміі на Варшаву, дзейнасць атрада Булак-Балаховіча. Аднак сама кніга ў першую чаргу прысвечана жыццю Заходняй Беларусі, якая, паводле польскіх улад, была нічым іншым як “крэсамі ўсходнімі”. Кульмінацыя рамана “Валошкі на мяжы” прыпадае на апісанне моманту ўз’яднання беларускіх тэрыторый у 1939 г., якое прыспешыла ўсталяванне сацыялістычнага ладу на землях, што працяглы час знаходзіліся пад уладай Польшчы. Раман “Вайна” прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай, пададзеным з пункту гледжання персанажаў, якія не так даўно далучыліся да савецкага жыцця. У рамане “Пасля вайны” паўстаюць складаныя шляхі да аднаўлення грамадства пасля вызвалення ад фашысцкай акупацыі.

Ужо толькі пералік вузлавых момантаў, якія так ці інакш паўплывалі на лёс сям’і Кужаляў, на наш погляд, сведчыць пра дэталёвую распрацоўку У. Гніламёдавым матыву навалы-кантынуума. У адпаведнасці са спецыфікай грамадска-палітычнага жыцця, што часам набывала ўласцівасці бясконцага катаклізму, пісьменнік скрупулёзна выбудаваў прастору сямейнай хронікі. Мастацкая “формула” навалы-кантынуума, паводле назіранняў Лявона Кужаля, выглядала так: “Чаму лёс такі? Іспыт за іспытам! Столькі, здаецца, пераЖылі! Бежанства, вайна, рэвалюцыя, кроў, голад … А канца няма! Ці будзе ён калі – канец той? Не, мусіць, не!” [2, с. 51]. Паказальна, што персанаж не аднаразова звяртаўся да гэтай праблемы, раз-пораз акцэнтуючы ўвагу на розных яе аспектах: “колькі сябе помню, так было. Ужо, здаецца, на ногі становішся, акрыяў, і раптам нешта такое грамыхне, што ты ўжо не ты, а іншае нешта” [3, с. 455]. Акрамя таго, з цягам часу персанаж усё менш эмацыянальна рэагаваў на бясконцыя змены, па-філасофску ацэньваў

сваё месца і функцыі ў сусвеце, разумеючы, што ён не здольны прыпыніць навалу-кантынуум, выбавіцца з яе абдымкаў. Сімптаматычна, што катастрафізм эпохі У. Гніламёдаў засведчыў своасаблівым проціпастаўленнем-прыпадабненнем жыцця Усходняй і Заходняй Беларусі, якія выглядалі як два кавалкі аднаго люстэрка, дзе адбіваліся ўсё тыя ж нацыянальны прыгнёт, моўнае пытанне, стаўленне да чалавека як да нічога не вартай істоты.

Заўважым яшчэ адну спецыфічную рысу пазначаных кніг: з аднаго боку, мастак слова выдатна ўсведамляў, што апавядае пра падзеі, аддаленыя ад яго часу. Але нягледзячы на такую адмысловую дыстанцыю, чытач, на думку М. Тычыны, існаваў у "рэжыме "рэальнага часу і прасторы" [4, с. 417], бо У. Гніламёдаў правёў вялікую падрыхтоўчую працу, сабраўшы ў адно сямейныя гісторыі, архіўныя матэрыялы, гістарычныя факты і плён уласнай фантазіі. Сакавітае беларускае слова і майстэрства сюжэтабудовы дазволілі адмыслова паяднаць абсалютна розныя крыніцы ў арганічнае цэлае.

Яшчэ ў 1977 г. У. Гніламёдаў сфармуляваў некалькі канцэптуальных думак, звязаных з развіццём сучаснага яму айчыннага мастацтва слова. У артыкуле "Пісьменнік і навізна жыцця" навукоўца адзначаў: "Беларуская проза – гэта цэлы свет герояў, ідэй, гэта жывы, дынамічны працэс, звязаны з надзённымі праблемамі жыцця. Сэнс чалавечага існавання, жыццё і смерць, каханне, адносіны да працы, да зямлі, да прыроды, мінулае і будучыня – сацыяльная і маральная насычанасць гэтай праблематыкі надае вагомасці і значнасці героям нашай літаратуры, іх роздуму і ўчынкам" [5, с. 43–44]. У пэўнай ступені гэтыя назіранні пазней адбіліся на яго творах, якія ў рэтраспектыўным плане раскрывалі актуальныя і для пачатку XXI ст. тэмы і праблемы.

Калейдаскоп падзей і чалавечых лёсаў у творах У. Гніламёдава адмыслова "структуруецца" постаццю Лявона Кужаля, "вечнага працаўніка, які ўстойліва трымаецца свайго земляробчага занятку і сваіх пераканнаняў аб непатрэбнасці бунтаў, рэвалюцый і войнаў, у аснове якіх ляжаць нянавісць і злапомнасць" [6, с. 176]. Менавіта эвалюцыя ўнутранага свету дадзенага персанажа прыцягвае чытацкую і даследчыцкую ўвагу. У падобным ракурсе творы ўспрымаюцца як адмысловы "раман выхавання", у шырокім сэнсе прысвечаны беларусу, які вытрываў усе перыпетыі першай паловы XX ст. і не страціў уласнай і нацыянальнай годнасці. Акрамя таго, на думку В. Локун, "раманная прастора У. Гніламёдава, пазначаная прыкметай эпічнай запаволенасці, пераклікаецца з паэтыкай класічнага эпасу з яго няспешным рухам, з адчуваннем усеагульнага адзінства" [7, с. 192].

На нашу думку, імя галоўнага героя, абранае У. Гніламёдавым, знакавае. У дадзеным выпадку супалі два фактары: па-першае прататыпам Лявона Кужаля стаў дзед У. Гніламёдава – Лявонцій Міхайлавіч Сцепанюк; па-другое, дарагое для пісьменніка імя адсылала і да Лявона Задумы, створанага М. Гарэцкім, каб распавесці пра складаныя гістарычныя перыпетыі першай трэці мінулага стагоддзя. Сімптаматычна, што ў выпадку з аўтарам дакументальна-мастацкіх запісак "На імперыялістычнай вайне" Задума паўставаў як па-мастацку выпісаны "alter ego" празаіка – носьбіт падобнага светапогляду і духоўнага складу, постаць, што дазваляла выказаць свету самыя патаёмныя думкі насуперак грамадска-палітычным абставінам. Што датычыцца Лявона Кужаля – гэта персанаж, пабачаны У. Гніламёдавым з вялікай часавай адлегласці ва ўсёй яго супярэчлівасці. Адзначым, што і тут не абышлося без эмацыйнасці, бо мастак слова ўсё ж такі звяртаўся да гісторыі свайго роду і нацыі. Параўнальна-тыпалагічны разгляд двух літаратурных вобразаў дазваляе сцвярджаць, што нават з цягам часу канстантамі беларускага асобаснага мікракосму застаюцца "памяркоўнасць, чалавечая прыстойнасць, дабрыня, справядлівасць і … укаранёнасць у родную зямлю, бязмерная любоў да яе і да родных людзей" [8, с. 171].

У. Гніламёдаў звярнуўся да сакраментальнага запытання, каб сфармуляваць вектар скразных для ўсіх раманаў экзістэнцыйных пошукаў Лявона Кужаля. Яшчэ ў дзяцінстве герой спытаў у сусвету, "навошта чалавек жыве?" [9, с. 31]. Простае па сваёй слоўнай афармленасці выказванне хавала за сабой глыбокі змест, які М. Гарэцкі некалі ёмка назваў "патаёмным". На нашу думку, менавіта пошукі "патаёмнага" ў мірны і ваенны час зніталі лепшыя ўзоры айчыннай прозы XX ст. Паводле У. Гніламёдава, асабліва актуальнымі яны сталі, калі ў першай палове мінулага стагоддзя "свет пазбавіўся пэўнасці, пастаянства, раптоўна парушыўся заведзены трыб" [10, с. 93], а чалавек апынуўся разменнай манетай у малазразумелай гульні гісторыі.

Рытарычнае пытанне "навошта чалавек жыве?" набыло некалькі варыяцый, шчыльна звязаных з перыпетыямі жыцця галоўнага героя. У Амерыцы беспрацоўны Кужаль пытаўся ў сусвету: "Нашто я прыехаў сюды? Прывалокся, а цяпер? Хоць ты засіліся! … А можа, жыццё і не варта таго, каб жыць? Бо які ж сэнс у такім існаванні? Дзе выйсце?" [9, с. 349]. Ідэя звесці рахункі з жыццём нарадзілася ў персанажа з-за матэрыяльных нястач; акрамя таго, на думку аўтара, персанаж не паспеў канчаткова адаптавацца да амерыканскага светапогляду, які ў радыкальна-стэрэатыпным выглядзе можна было сфармуляваць так: "працуй, заставайся цвярозым, не забывай пра Бога, і ты абавязкова даможася поспеху" [9, с. 291]. Сімптаматычна, што Лявон Кужаль трымаўся асноўных пастулатаў "амерыканскай мары", але жаданы вынік то набліжаўся, то станавіўся амаль недасяжным, тым самым памнажаючы пытанні да сябе і свету.

Наступным кульмінацыйным момантам у жыцці персанажа сталася Першая сусветная, якая паволі насоўвалася на сям'ю Кужаляў. Ініцыяцыя на вайне адбылася ўжо ў час, калі прускаўцы накіраваліся

ў выгнанне. Стаўшы бежанцамі, яны спрабавалі спасцігнуць сутнасць адмысловай кары, што змяніла іх сацыяльны статус і светапогляд, бо на новым месцы яны зрабіліся практычна маргіналамі. Жывучы ў расійскай глыбінцы, героі зазналі абуджэнне "дзвюх душ": адна з іх існавала ў рэальным часе і прасторы Запалоннага, другая прыводзіла да таго, што "сваё, пруская ўскае, не выходзіла з галавы. Што там дома? Ці хутка пагоняць немца?" [10, с. 134].

Логіка гістарычнага працэсу паступова падводзіла Лявона Кужаля да новага лёсавызначальнага моманту: удзелу ў вайне. Пакутнае жыццё навабранца, жахлівы акопны побыт і асобныя ўсплёскі баявой дзейнасці на фронце прымусілі героя зноў звярнуцца да сябе з невырашальнымі пытаннямі: "Нашто вайна? Нашто смерць? Не ведаюць людзі, куды сілу падзець, – от і б'юцца. Колькі народаў на зямлі! Не палічыць. І ўсе могуць жыць дружна, а ваююць. Ніяк не могуць паладзіць! Няўжо чалавек створаны, каб усё гэта перацярпець? Калі так, дык ці варта на свет з'яўляцца?" [10, с. 272].

Не менш пытанняў выклікаў працэс трансфармацыі звычайнага чалавека ў салдата, які павінен вынішчаць ворага (перш за ўсё чалавека, асобу).Назіраючы быццам бы з боку за іншымі навабранцамі ў падрыхтоўчым лагеры, Кужаль "з нейкай няўцямнай цікавасцю ўглядаўся ў добрыя, цярплівыя аблічча салдат, у іх незласлівыя твары. Не верылася, што гэтыя людзі збіраліся забіваць нейкіх іншых людзей" [10, с. 250]. Паступова ўжо на фронце кожны з іх трапляў у жахлівы вір, што парадаксальным чынам сумяшчаў марудную хаду часу ў акопе і вар'яцкую хуткасць непасрэдна баявых дзеянняў. На думку У. Гніламёдава, на татальнай вайне асоба губляла індывідуальнасць, часам яна не несла адказнасць за ўласныя ўчынкі. Такая сітуацыя поруч з выпрабаваннем экстрэмальнымі фактарамі назаўжды змяняла псіхалогію жаўнера. Галоўны герой рамана «Расія», канешне ж, не змог даць вычарпальнае азначэнне перажытаму, але яго фінальная выснова пра Першую сусветную выглядала досыць ёміста: «вайна – гэта чыясьці забава, нейкі вялікі падман, змова сатанінскіх сіл, пра якую ніхто не ведае, але яна, змова гэтая, існуе» [10, с. 349].

Нягледзячы на тое, што Першая сусветная вайна фармальна скончылася для Лявона Кужаля ў шпіталі, ён яшчэ доўгі час прыгадваў перажытае, адчуваючы, як "штосьці ў ім моцна пахіснулася. Узмацніўся скепсіс, прыгнечанасць. Жыццё здавалася суцэльным ланцугом драм і трагедый" [10, с. 306]. У. Гніламёдаў спалучыў разважанні пра маральны стан асобнага персанажа з назіраннямі за цэлым пакаленнем ветэранаў, якія паўсталі як не "тыя ранейшыя людзі, маўклівыя і ціхмяныя …, вунь колькі ў іх смеласці ды нястрыманасці" [10, с. 345]. Падобныя радыкальныя змены не маглі не ўзмацніць жаданне даведацца, "навошта чалавек жыве?", навошта ён пакутуе на зямлі?

Перажытае ў выгнанні і на фронце не падрыхтавала Лявона Кужаля да рэвалюцыі 1917 г., якая стала адмысловым працягам сацыяльных разломаў пачатку XX ст. На думку пісьменніка, яго персанаж, выхаваны паводле традыцыйнай беларускай маралі, напружана асэнсоўваў новыя тэндэнцыі грамадскага жыцця, якое імкліва рухалася да Грамадзянскай вайны. Асноўныя сумневы персанажа сфармуляваны ў наступным унутраным маналозе: "Белыя, чырвоныя, яшчэ нейкія … Нічым яны фактычна паміж сабой не розняцца. Ваююць, ваююць, б'юцца … А можа, вайна – непазбежнае зло, і чалавек без яе не можа абысціся? Можа, яна ў прыродзе чалавека? І я ў гэтым, выходзіць, таксама ўдзельнічаю? А паспрабуй не паўдзельнічай!" [10, с. 461]. Заўважаецца, што Лявон Кужаль не жадаў атаясамліваць сэнс чалавечага быцця на зямлі выключна са змаганнем са зброяй у руках.

Пісьменнік бачыць повязь падзей Першай сусветнай вайны з далейшымі сацыяльнымі трансфармацыямі: асобныя "практыкаванні" на шляху да татальнага ўнутрыдзяржаўнага тэрору, заснаванага на класавай тэорыі, былі выкананы яшчэ ў 1914 – 1916 гг., калі шараговыя салдаты зведалі крах старых аксіялагічных канстант (перш за ўсё яны датычыліся вартасці асобнага жыцця, якое страціла сакральнасць). Сусветная бойня стала жахлівым урокам для многіх ўдзельнікаў, бо яна засведчыла абсалютную слабасць цела і псіхікі чалавека перад траўматычным уздзеяннем сродкаў масавага вынішчэння. Акрамя таго, на сусветнай вайне сфармаваліся такія людзі, што апантана рухаліся ў віры падзей, мала зважаючы на мараль. Пасля 1917 г. праблемы асабістай адказнасці за ўласныя ўчынкі і адэкватнай ацэнкі іх матываў набыла надзвычайную актуальнасць. Хаваючыся за ідэямі сацыялістычнага будаўніцтва ці адраджэння манархіі, удзельнікі грамдзянскай вайны "дзейнічалі, забыўшы на літасць", для іх "чалавечае жыццё – нуль без палачкі" [10, с. 512]. Але на думку Лявона Кужаля (выразніка аўтарскай пазіцыі), "не так усё проста: забіваючы іншага, чалавек знішчае адначасова і сябе. Падумаць дык ахвяры вартыя сваіх катаў. І адны, і другія, і трэція намагаюцца перайначыць свет на свой лад" [10, с. 512].

Паказальна, што персанаж імкнуўся захаваць хаця б адносную аўтаномнасць, не купляўся на заклікі, якія апелявалі хутчэй да інстынктаў, чым да розуму. Назіраючы за неадэкватнымі і амаральнымі паводзінамі белых і чырвоных, герой выпрацоўваў уласнае крэда: "тут ужо нічога не зробіш, застаецца толькі паклапаціцца пра сябе самога, каб хоць асабістую прыстойнасць больш-менш захаваць" [10, с. 554]. Паводле У. Гніламёдава, падобная пазіцыя была не праявай эскапізму, а хутчэй невыканальным жаданнем адасобіцца ад вар'яцтва сусвету, сысці ва "ўнутраную эміграцыю", каб канчаткова не згубіць уласную душу. Адасобленасць ад іншых не раз турбавала персанажа, які, напрыклад, разглядаў гіпатэтычную

магчымасць далучыцца да будаўнікоў сацыялізму, але набыты вопыт прыводзіў да высновы, што "відаць, ён лішні тут сярод тых, хто будуе новы свет. Яму трэба заставацца ў старым. Па-новаму ён ужо не патрапіць" [10, с. 595]. На думку галоўнага героя, гэты эксперымент нагадваў сумнавядомую біблейскую гісторыю будаўніцтва Вавілонскай вежы: амбіцыйная задума прынесла толькі хаос і неўпарадкавасць. Пазней, ужо вярнуўшыся ў Пруску, Лявон Кужаль перанёс свае погляды і на грамадска-палітычнае жыццё Заходняй Беларусі.

Існаванне ва ўмовах бясконцага сацыяльнага катаклізму нараджала і іншыя пытанні філасофскага кшталту: "ці вартыя людзі гэтага цудоўнага свету, у якім нарадзіліся, гэтага сонца, прыроды?" [2, с. 79]. Па-новаму яны загучалі ў кантэксце бясконцых размоў-спрэчак Лявона Кужаля з "дэманам рэвалюцыі" ("апосталам рэвалюцыі"?, ае ахвярай?) Кляновікам, які лічыў мэтазгодным татальнае ўмяшальніцтва чалавека (абавязкова камуніста) у быццё дасюль непадуладных яму сіл. Беларускі селянін, паводле У. Гніламёдава, больш рэалістычна ставіўся да жадання апалагетаў сацыялізму стварыць новы гатунак людзей ці змяніць хаду пораў года. Аўтар неаднаразова падкрэсліваў абвостранае надзвычайнымі сітуацыямі адчуванне хараства жыцця, якое не пакідала Лявона Кужаля напрацягу ўсіх выпрабаванняў.

У рамане "Вайна" апавядальнік поруч з персанажамі прыходзіць да высновы, што нягледзячы на выпрабаванні і спробы перарабіць чалавечую псіхалогію, асоба захоўвае шэраг рыс, якія сведчаць не толькі пра адаптыўнасць да аксіялагічных змен, але і пра наяўнасць пэўных канстант. Дарэчы, апошнія пададзены без прыхарошванняў: "Чалавек, кажуць, цар прыроды! Але звярынага, я табе скажу, у ім многа, і кожны на сваё хварэе. Адзін багацця надта хоча, другі – улады. І ні на што не зважаюць. Вось людская кроў і ліецца" [11, с. 42]. Менавіта спалучэнне адмоўнага і станоўчага ў чалавеку дэталёва разглядаецца ў сувязі з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, якія ўспрымаюцца як чарговая кропка біфуркацыі на шляху беларусаў.

На нашу думку, у названым рамане адбываюцца значныя для ўспрымання постаці Лявона Кужаля трансфармацыі. Па-першае, персанаж, стомлены пошукамі адказу на пытанне "навошта чалавек жыве?", прыйшоў да высновы, што "ўсё гэта – і дзядуля, і ветах, і дождж, і раса на траве, і Камянецкі стоўп – усё гэта адзін ланцуг жыцця, якое працягваецца, плыве з мінулага ў будучыню і валодае нейкай дзіўнай неадольнай і ўсёпераможнай сілай, перад якой … ніхто і нішто не можа ўстаяць. А вайна? … Вайна – гэта цяжка, цяжка ўсім – і прыродзе, і чалавеку. Але як бы ні было, усё роўна ўсё разам – гэта жыццё, і трэба жыць, знаходзячы, чым жыць" [11, с. 64]. Таямніца чалавечага існавання толькі часткова прыадкрылася перад унутраным зрокам героя, які вырашыў меней часу бавіць на росшукі недасяжнага, а засяродзіцца на самім працэсе жыцця, атрымаць асалоду ад яго станоўчых праяў. Па-другое, Вялікая Айчынная ўсё ж здолела вывесці Кужаля са стану "ўнутранай эміграцыі", пацвердзіўшы неабходнасць паяднаць індывідуальнае хаця б з асобнымі запатрабаваннямі грамады (паводле І. Шаладонава, асноўным спосабам жыцця пасля чэрвеня 1941 г. стала саборнасць [12]).

**Заключэнне**. Раманы У. Гніламёдава – адмысловая спроба асэнсаваць нацыянальную гісторыю XX ст. у жанры сямейнай хронікі. Асобныя раманы ў дадзеным выпадку яднаюцца скразным пытаннем "навошта чалавек жыве?", зададзеным галоўным героем Лявонам Кужалем. Праходзячы выпрабаванне падарожжам у Амерыку, двума сусветнымі войнамі, рэвалюцыяй, жыццём у Заходняй Беларусі да 1939 г., персанаж і апавядальнік падводзяць пэўныя вынікі сваім развагам. Герой усведамляе, што матэрыяльны дабрабыт не гарантуе шчаслівага існавання, што асоба не дасягае гармоніі, спрабуючы самасцвердзіцца праз уціск іншых, што сэнс свайго быцця нельга атаясамліваць выключна з узброенай барацьбой, якая гіпатэтычна можа прывесці да нейкіх станоўчых грамадска-палітычных змен. У. Гніламёдаў адмыслова распрацоўвае матыў навалы-кантынуума, звяртаючы пільную ўвагу на захаванне асабістай і нацыянальнай годнасці свайго скразнога персанажа – Лявона Кужаля – у самых неспрыяльных варунках (пад час Першай сусветнай, Грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войн). У раманах падкрэслена аб'ектыўная немагчымасць канчатковага адказу на пытанне "навошта чалавек жыве?". Адначасова ў кнізе "Вайна" сцвярджаецца думка пра повязь самых разнастайных падзей у адзіны ланцуг, і прымаючы яго наканаванасць за нешта натуральнае, персанаж адчувае палёгку. Такім чынам, узнікаюць больш філасофскія адносіны да таго станоўчага і адмоўнага, што нечакана прыносіла чалавеку эпоха войн і рэвалюцый.

## ЛІТАРАТУРА


1. Шаўлякова-Барзенка, І. Проза / І. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Т. 4. Кн. 3. – 2-е выд. – Мінск : Белар. навука, 2015. – С. 8–35.
2. Гніламёдаў, У. Вяртанне / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ-ра, 2008. – 429 с.
3. Гніламёдаў, У. Валошкі на мяжы / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ-ра, 2014. – 574 с.
4. Тычына, М. Уладзімір Гніламёдаў / М. Тычына // Народ і вайна. – Мінск : Белар. навука, 2015. – С. 411–422.

5. Гніламёдаў, У. Пісьменнік і навізна жыцця / У. Гніламёдаў // Як само жыццё: Кніга бягучай крытыкі. – Мінск : Маст. літ-ра, 1980. – С. 43–68.
6. Драздова, З. Асаблівасці мастацкага адлюстравання падзей і асоб Першай сусветнай вайны ў рамане Уладзіміра Гніламёдава "Расія" / З. Драздова // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7-8 кастрычніка 2014 г. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 176–179.
7. Локун, В. Вайна як трагедыя народнага лёсу ў творчасці Уладзіміра Гніламёдава / В. Локун // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7-8 кастрычніка 2014 г. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 190–196.
8. Русілка, В. Беларус на Першай сусветнай вайне ў мастацкім асэнсаванні Уладзіміра Гніламёдава / В. Русілка // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7-8 кастрычніка 2014 г. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 171–175.
9. Гніламёдаў, У. Уліс з Прускі / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ-ра, 2006. – 382 с.
10. Гніламёдаў, У. Расія / У. Гніламёдаў. – Мінск : Харвест, 2007. – 672 с.
11. Гніламёдаў, У. Вайна / У. Гніламёдаў. – Мінск : Белар. навука, 2014. – 628 с.
12. Шаладонаў, І. Саборнасць як асноўны спосаб жыцця і змагання ў рамане У. Гніламёдава "Расія" / І. Шаладонаў // Этот день мы приближали, как могли … : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию Победы в Великой Отечественной войне и окончания Второй мировой войны, Минск, 7–8 мая 2015 г. : в 2 ч. – Ч. 2. – Минск : Белар. навука, 2016. – С. 120–124.

*Паступіў 23.06.2019*

## 'WHY DO PEOPLE LIVE?'
## PHILOSOPHICAL AND SOCIO-POLITICAL ISSUES IN U. HNILAMIODAŬ'S NOVELS

***Z. TRATSIAK***

*The article is devoted to U. Hnilamiodaй's novels 'Ulysses from Pruska', 'Russia', 'The Return', 'Cornflowers on the Border' and 'War' in connection with the notion of continuous war. The influence of periodic social and political upheavals on the personality of the character of ordinary Belarusians is analyzed. Different approaches to the conceptual question 'why do people live?' are revealed. They depend on the social situation, heroes' experience and outlook. It is pointed out that the inability to answer this question leads some of U. Hnilamiodaй's characters to the perception of life as a complex of positive and negative factors.*

***Keywords:*** *Belarusian literature, family saga, continuous war, U. Hnilamiodaй.*